Мая першая казка

# Зімовішча звяроў



Мінск Харвест

Ішоў неяк Бык праз зімовы лес і сустрэў Барана:

– Ты куды ідзеш, Баран? – пацікавіўся Бык.

– Шукаю, дзе б перазімаваць, – адказаў Баран.

– То і я з табой!

Пайшлі яны ўдваіх і сустрэлі Свінню.

– Ты куды ідзеш, Свіння?

– Вось думаю, дзе б зіму перачакаць, – адказала ім Свіння.

– Хадзем з намі, разам весялей!



Пайшлі яны ўтраіх і сустрэлі Гусака.

– Ты куды ідзеш, Гусак?

– Ды вось шукаю, як зіму перабыць, – адказвае Гусак.

– Дык хадзем з намі, мы таксама зімовішча шукаем!

Пайшлі яны разам учатырох. Ідуць, песні спяваюць, а насустрач Певень.

– Ты куды ідзеш, Певень?

